Жыві, Беларусь!

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Орган Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

№ 124 (137) 28 чэрвеня 1991 г. Пятніца.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

ФАКС — Факты, Аргументы, Комментарии, Суждения

«Мы, украинцы Белоруссии...»

МИНСК (А. Коба). **В Комиссии по образованию, культуре и сохранению исторического наследия и в Комиссии по национальной политике и межнациональным отношениям Верховного Совета БССР состоялась встреча с представителями Ассоциации украинцев Белоруссии «Ватра», украинского общественно-культурного объединения Брестской области.**

На встрече обсуждены вопросы практической реализации союзных и республиканских законов о языке, культуре, образовании, сохранении и развитии среди украинцев, проживающих в Белоруссии, украинского языка, народных традиций, обычаев.

Стрелка виновата

На станции Буйничи в Могилевской области на днях образовался небольшой пруд из бензина А-76.

Произошло это потому, что при маневрировании состава с девятью цистернами, предназначавшимися облнефтебазе, четыре цистерны сошли с рельсов. По предварительным данным, авария произошла из-за неисправности стрелки.

Ау, спонсоры!

МИНСК. **По крайней мере на полгода отложено первое рабочее совещание ученых, которое должно было состояться в Минске под эгидой ЮНЕСКО и АН БССР.**

Речь идет о создании широкой международной научно-исследовательской сети, которая объединит усилия и опыт специалистов многих стран в изучении и решении чернобыльских проблем. Этот проект — один из 70, что вошли в специальную программу «ЮНЕСКО — Чернобыль». Однако, когда начнется его осуществление, сказать трудно, ведь у ученых пока нет даже тех 12 тысяч долларов, что необходимы для организации первой встречи. Спонсоры, откликнитесь: борьба с радиацией требует средств!

Конкуренты в борьбу не вступали

ГОМЕЛЬ (А. Готовчиц). **После переноса наконец-то состоялась пятая сессия областного Совета народных депутатов. На ней, помимо прочих, рассматривался и организационный вопрос.**

Сессия освободила от обязанностей председателя облсовета первого секретаря обкома КПБ Александра Граховского. Отныне у него остается лишь партийный портфель и должность члена президиума облсовета.

Новым председателем областного Совета народных депутатов избран Николай Войтенков, который является одновременно и председателем облисполкома. Войтенкову — 44 года. По образованию он инженер-механик. В ответ на вопрос, не трудно ли будет ему совмещать работу в Верховном Совете БССР с двумя должностями в облсовете, Николай Григорьевич выразил готовность сложить полномочия народного депутата БССР ради продуктивной работы в области.

Кандидатура Николая Войтенкова была в единственном числе внесена в список для тайного голосования. Сняли свои кандидатуры депутаты Константин Костенко, Валерий Селицкий. Отказался баллотироваться на высшую должность в облсовете и председатель Постоянной комиссии Верховного Совета БССР по чернобыльским проблемам, депутат областного Совета Иван Смоляр, мнение которого пришлось выяснять по телефону.

Обнародован проект

«Договора о Союзе суверенных государств», детально и неоднократно рассмотренный, измененный и уточненный полномочными представителями республик. Советом Федерации и подготовительным комитетом, образованным четвертым Съездом народных депутатов СССР.

Проект направлен на рассмотрение в Верховные Советы республик и Верховный Совет СССР.

Документ будет опубликован в завтрашнем номере «Народной газеты».

В двух словах

● **Сегодня в Минске будет проходить заседание Совета Министров иностранных дел Союза ССР и суверенных республик. Тема беседы министров — ликвидация последствий чернобыльской катастрофы.**

● **В столице республики состоялась учредительная конференция Белорусского отделения Фонда национальной и международной безопасности. Эта неправительственная организация ищет нетрадиционные подходы в решении острых социально-экономических, экологических, политических и нравственных проблем, достижения общегражданского мира и согласия. Контактный телефон — 34-76-67.**

Остальные пусть крутятся сами

МОСКВА. **Верховный Совет СССР после долгих и весьма острых дебатов наконец-то принял Закон об индексации доходов населения, давно уже ожидаемый обществом.**

Закон должен помочь защитить от роста цен на потребительские товары малообеспеченные слои населения, прежде всего пенсионеров, учащихся, многодетные семьи, инвалидов. Бремя заботы о них возложено на государство. Что касается рабочих и служащих предприятий, организаций и учреждений, состоявших на хозяйственном расчете, то индексацию их заработной платы предусмотрено производить за счет средств самих предприятий, организаций и учреждений.

Чего не сделаешь ради второй половины человечества!



РАБОТА И ДОМАШНИЙ ОЧАГ

Сколько времени тратит советская женщина, занятая в общественном производстве, на ведение домашнего хозяйства (часов, минут)

	рабочие и служащие		колхозницы	
	будни	выходные	будни	выходные
приготовление пищи	1,28	2,14	1,47	2,23
стирка, глажение	26	1,16	36	1,20
покупка продуктов	28	40	19	23
уборка квартиры	21	53	27	49
шитье, вязка, уход за одеждой, обувью	17	44	13	35
уход за детьми	13	24	16	33
покупка непродовольственных товаров	8	15	6	10
ремонт бытовых приборов, мебели, жилья, отопление	3	7	10	25
получение услуг	2	2	1	1
всего	3,30	6,41	4,01	7,01

Исследование Госкомстата СССР
Источник: "Вестник статистики" N 2.91

Студия ХОСИ — АДС "Гарант" Минск 36-89-40

(О. Тишков). **Домашняя работа женщин не оплачивается и, следовательно, не находит отражения в официальной статистике.**

Согласно данным Международной организации труда, стоимость домашней работы, выполняемой женщинами, если ее исчислять в качестве эквивалента услуг, выполняемых поварами, уборщицами и медицинскими сестрами, может составить до половины ВНП многих стран.

Женщины составляют половину населения мира, но выполняют две трети работы.

Дважды лидер

ОРША (О. Шутова). **Пока Николай Разумов, рабочий инструментального завода, один из организаторов рабочего движения в городе, голодал у здания исполкома, декларируя политические требования Верховному Совету республики, коллектив завода на общем профсоюзном собрании избрал его председателем профкома.**

Претендентов на эту должность было пятеро: зам. начальника цеха, старший мастер, инженер, зам. председателя профкома. Выбрали рабочего. За него проголосовали 1053 рабочих и служащих завода. Еще до профсоюзной конференции, которая должна была утвердить итоги счетной комиссии, на заводе начал принимать поздравления новый профсоюзный лидер.

Цыплят по осени считают...

Вчера в Минске состоялся съезд Союза аграрников Белоруссии

Тяжелые времена наступили для белорусского села — сейчас даже хозяйства-миллионеры вынуждены считать каждую копейку... Защититься в условиях переходного к рынку периода в одиночку невозможно. Нужна сила, крепкий союз аграрников, с которым были бы вынуждены считаться и парламент, и правительство перед принятием любых, касающихся села, законов и мер.

Есть ли такая сила сейчас? Формально — да. Устав Союза аграрников Белоруссии зарегистрирован в Министерстве юстиции БССР, в трудовых коллективах сейчас действует более 700 первичных организаций. Польза от такой работы была. В частности, с хозяйств списаны долги в сумме 1,4 млрд. рублей, им также выплачена 50-процентная надбавка к ценам — еще 600 млн. рублей, принят Закон Белорусской ССР «О приоритетном социально-культурном и экономическом развитии села и агропромышленного комплекса» и т. д.

Однако, как отмечалось на съезде, все это далеко не то, что надо. Союз аграрников зачастую шел в «хвосте» нежелательных событий, а не упреждал их. Да и структурно, и организационно он еще очень слаб.

И хотя очередной съезд Союза аграрников, приняв соответствующие постановления, закончился на оптимистической ноте, оценку его итогам лучше всего выставит все-таки жизнь.

Найден

один из виновников трагедии, случившейся в караульном помещении воинской части в Могилевской области.

Он задержан близ деревни Малиновка Быховского района. У задержанного изъяты автомат и восемь магазинов с патронами. Причина случившегося устанавливается. Ведется поиск второго бежавшего военнослужащего.

Выпуск «ФАКСа» подготовлен по сообщениям корреспондентов «Народной газеты» и агентства «Инфоновости».

Дежурила Ирина ДЕРГАЧ.

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов.

На сесіі Вярхоўнага Савета БССР

Ураду—новыя паўнамоцтвы, парламенту—больш грошай

«Дайце мне кропку апоры, — і я перавярну зямны шар», — гаварыў старажытны вучоны. Нешта падобнае адбывалася пазаўчора і ўчора ў Вярхоўным Савеце. Урад рэспублікі ў асобе першага намесніка Старшыні Савета Міністраў Міхаіла Мясніковіча сцвярджаў у дакладзе, што Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, Старшыня Вярхоўнага Савета, урад і прэм'ер-міністр фактычна пазбаўлены магчымасці эфектыўна кіраваць сацыяльна-эканамічнай абстаноўкай.

Урад папрасіў даць яму права ўскладаць адказнасць не толькі на прадпрыемствы, але і на канкрэтных службовых асоб. У палітыцы цэн Савет Міністраў прасіў даць яму права пры неабходнасці замарожваць цэны на асобныя віды тавараў і паслуг, рабіць абмежаванні на ўзровень ставак за карыстанне банкаўскім крэдытам. На думку ўрада, больш уладарныя функцыі павінен мець і прэм'ер-міністр: вызваляць ад займаемых пасад і прызначаць міністраў, адхіляць ад выканання абавязкаў службовых асоб выканаўчых органаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў...

— У апошні час,—сказаў пад канец першы намеснік прэм'ер-міністра, — стала модным крытыкаваць урад. Але давайце будзем аб'ектыўнымі. Не атрымаўшы ў вас дазволу на прадстаўленне названых у праекце паўнамоцтваў, рэальнага ўмацавання выканаўчай улады не будзе, а будзе яе бяссілле.

Думку Пастаяннай камісіі па заканадаўству з трыбуны выказаў намеснік старшыні Уладзімір Станкевіч. Яна была вельмі крытычнай. Напрыклад, некаторыя паўнамоцтвы, аб якіх прасіў Савет Міністраў, з поспехам можа выконваць вышэйшы гаспадарчы суд, некаторыя — пракуратура... Незразумела таксама, чаму Савет Міністраў хадайнічае аб наданні больш шырокіх паўнамоцтваў Прэзідыуму Вярхоўнага Савета: няўжо ён не можа выступіць з ініцыятывай сам? І як выснова — прапанаваны законапраект зняць з абмеркавання, паколькі няма падстаў для пераразмеркавання паўнамоцтваў.

Падтрымаў прапанаваны законапраект дэпутат Барыс Макейчанка. Праўда, падтрымка была вельмі своеасаблівай: артылерыйскі ўдар прамоўца скіраваў супраць апазіцыі: «Чаму апазіцыя выступае супраць? Таму, што яна не хоча стабілізацыі эканамічнага становішча ў рэспубліцы. Узамен яна не прапанавала нічога... Далей было выступленне па Саюзнаму дагавору. Апазіцыя таксама супраць яго... Бачыце, ён нават слухаць не ўмее, гэты прадстаўнік апазіцыі. Вось яго крэда. Як пакрычаць на вуліцы, то ён першы».

Гэты ўрывак паказвае ўзровень узаемаадносін дэпутатаў паміж сабой, узровень майстэрства прамоўцаў.

Дэпутат Уладзімір Гаркун заклікаў усіх падтрымліваць і дапамагаць ураду. Міхаіл Мачуленка выказаў меркаванне, што частка дэпутатаў кроўна зацікаўлена ў тым, каб скампраметаваць камуністычны ўрад. «Навошта,—пытаў ён,— здзеквацца над уласнай рэспублікай і сцвярджаць аб нейкай Вандэі, аб нейкім кансерватызме жалезабетонным, аб нейкім камуністычным «оплоте», які цягне нас назад, да адміністрацыйнай сістэмы?»

Як бачыце, любая дыскусія ў Вярхоўным Савеце носіць палітычны характар. Слоўная тузаніна з'ядае шмат часу — і соль пытання часам губляецца, адыходзіць на другі план.

Урад атрымаў пункт апоры. Ці зварухнецца ж наша жыццё, ці пачне выхад з чорнай паласы? На гэта пытанне пакуль што ніхто нічога не адкажа.

Прайшло амаль што без эмоцый пытанне аб пераходзе ўсіх саюзных прадпрыемстваў, што размешчаны на тэрыторыі Беларусі, у юрысдыкцыю рэспублікі. Па-першае, права на ўсю ўласнасць у межах рэспублікі было раней заяўлена ў прынятым Законе аб народаўладдзі; па-другое, правы рэспублік былі прызнаны даўно ў падмаскоўным Нова-Агарове, і нічога радыкальнага, нечаканага само пытанне ўжо не ўносіла.

Затое парушыла ціхую атмасферу пытанне аб каштарысе расходаў Вярхоўнага Савета БССР. Інфармацыя, з якой выступіў начальнік Сакратарыята Аляксандр Анціпенка, выклікала шквал пытанняў і самых розных меркаванняў.

Калі ў мінулым годзе выдаткі на дзейнасць Вярхоўнага Савета склалі каля 4 мільёнаў рублёў, то на гэты год, як паведаміў Аляксандр Анціпенка, патрабуецца 15 мільёнаў 268 тысяч рублёў. Зразумела, трэба ўлічваць рэзкае павелічэнне цэн, тое, што ў мінулым годзе парламент працаваў толькі з мая... Чаму ж тады так узвінчана рэагавала зала на фінансавую інфармацыю? Мы ў агульнай масе — як дэпутаты, так і выбаршчыкі — бедныя людзі, бедныя матэрыяльна і бедныя духам. На вуліцах нашых гарадоў з'явіліся жабракі — гэта крайнасць. Але ж і ўвогуле мы жывём па самых прымітыўных мерках, калі набыццё тэлевізара альбо пральнай машыны становіцца велізарнай падзеяй у жыцці сям'і... Таму любое паведамленне аб павышэнні каштарысу на ўтрыманне дэпутатаў, Вярхоўнага Савета будзе ўспрынята, мякка кажучы, без энтузіязму. Нават самі народныя выбраннікі пыталіся адзін у аднаго: што ж мы робім? Ужо не шэптам, за кулісамі, а з трыбуны называліся плануемыя лічбы: аклады старшынь пастаянных камісій у 1600 рублёў, іх намеснікаў і сакратароў камісій — у 1200 рублёў, грашовыя штомесячныя выплаты дэпутатам — 250—300 рублёў....

Уладзімір Заблоцкі і Алег Трусаў прапаноўвалі значна павысіць аклады першым асобам у рэспубліцы — у 7 разоў у параўнанні з сярэдняй заработнай платай.

Для выплаты зарплаты работнікам Сакратарыята і дэпутатам плануецца выдзеліць амаль 4 мільёны рублёў.

Кажуць, што ў чужой кішэні грошы не лічаць. Вярхоўны Савет лічыў іх ва ўласнай. На маю думку, любая зарплата па-

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў БССР

Няма, бадай, сёння для ўрада нашай рэспублікі больш адказнай задачы, чым пераадоленне вынікаў чарнобыльскай катастрофы, сацыяльная абарона грамадзян, якія пацярпелі ад яе. На чарговым пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў БССР абмеркаваны праблемы раённых цэнтраў Гомельскай вобласці, размешчаных на тэрыторыях з узроўнем радыеактыўнага забруджвання больш як 15 кюры на квадратны кіламетр. Выказана рэзкая крытыка ў адрас некаторых міністэрстваў і ведамстваў, якія нярэдка забываюць аб сваім абавязку перад людзьмі, што знаходзяцца ў зоне бедства. Па выніках абмеркавання адпаведным падраздзяленням Савета Міністраў БССР разам з зацікаўленымі арганізацыямі, медыцынскімі і навуковымі ўстановамі даручана дапрацаваць праект пастановы і ў бліжэйшы час унесці яго ва ўрад рэспублікі.

Прыняты пастановы аб арганізацыі вытворчасці будаўніча - дарожнай тэхнікі і тэхнічна складаных тавараў народнага спажывання на заводзе «Магілёўсельмаш» і ў мінскім навукова - вытворчым аб'яднанні «Дармаш», а таксама аб дадатковых мерах па паляпшэнню аховы мацярынства і дзяцінства ў Беларускай ССР.

Абмеркаваны і рад іншых актуальных праблем жыцця рэспублікі. Вёў пасяджэнне першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР М. У. Мясніковіч.

Служба інфармацыі Савета Міністраў БССР.

ЗАКОН
Белорусской Советской Социалистической Республики

О внесении дополнения в статью 53 Кодекса о браке и семье Белорусской ССР

Верховный Совет Белорусской Советской Социалистической Республики **постановляет:**

Внести в статью 53 Кодекса о браке и семье Белорусской ССР, утвержденного Законом Белорусской ССР от 13 июня 1969 года (СЗ БССР, 1969, № 17, ст. 278) следующее дополнение:

Часть вторую статьи после слов «с достоверностью подтверждающие признание ответчиком отцовства» дополнить словами «или происхождение ребенка от ответчика».

Председатель Верховного Совета Белорусской ССР Н. ДЕМЕНТЕЙ.

20 июня 1991 года,
г. Минск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Аб назначэнні старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Назначыць старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка Беларускай ССР таварыша БАГДАНКЕВІЧА Станіслава Антонавіча.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

21 чэрвеня 1991 г.
г. Мінск.

Наша гасцёўня

«Ні аброць, ні тым больш хамут прафсаюзы нікому не рыхтуюць, але і на сябе накінуць не дадуць»,—

гаворыць старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір Іванавіч ГАНЧАРЫК

— Уладзімір Іванавіч, жыццё паставіла перад намі шэраг вострых праблем. Але пачаць гаворку хочацца з іншага, з расказу аб Вас. Мы так мала ведаем пра кіраўнікоў. Ці не з-за таго некаторыя непаразуменні? Таму раскажыце, калі ласка, коратка аб сабе. Пра сям'ю, хобі...

— Нарадзіўся за год да вайны на Лагойшчыне. Бацька быў настаўнікам вясковай школы, франтавік. Маці — калгасніца, зараз на пенсіі. Скончыў Інстытут народнай гаспадаркі, кандыдат эканамічных навук. Працаваў эканамістам саўгаса, затым — на камсамольскай і партыйнай рабоце. Хутка пяць гадоў як у прафсаюзах. Народны дэпутат СССР. Жанаты, двое дзяцей. У вольны час люблю майстраваць, чытаць, неабыякавы да жывапісу.

— Дарэчы, як Вы пазнаёміліся з жонкай?

— Вучыліся разам у інстытуце, у адной групе. Вяселле было ў пакоі студэнцкага інтэрната.

— Цікава, якая кватэра ў лідэра прафсаюзаў?

— Трохпакаёвая, 43 квадратныя метры.

— А мэбля?

— Айчыннай вытворчасці. Спальнаму гарнітуру амаль чвэрць веку. Ёсць прымаўка — два пераезды — адзін пажар. А пераязджаць давялося каля дзесяці разоў.

— Ці ёсць дача, машына?

— Машына ёсць, дачы сваёй няма.

— Як праводзіце выхадныя дні?

— У суботу, як правіла, на рабоце. У нядзелю — з сям'ёй і ўнукамі.

— А што жонка падае на сняданак старшыні Федэрацыі прафсаюзаў?

— У асноўным гэта яешня са скваркай, я ўсёедны.

— Вячэраеце ўсёй сям'ёй, ці кожны паасобку?

— У большасці паасобку, паколькі я вяртаюся з работы позна.

— Каго Вы лічыце сваім галоўным настаўнікам у жыцці і чаму менавіта яго?

— Мне шанцавала ў жыцці працаваць з мудрымі, цікавымі людзьмі. Іх было шмат.

— Калі б Вам прапанавалі тры білеты на канцэрт: народнай песні, сімфанічнай музыкі і сучаснай рок-групы, які Вы узялі б? А які — Вашы дзеці?

— Мне па душы добрая музыка розных жанраў. Мяркую, што дзеці пайшлі б на канцэрт сучаснай папулярнай рок-групы.

— Колькі ў Вас сяброў? Ці часта сустракаецеся? Дзе і па чыёй ініцыятыве?

— Справа не ў колькасці. Добрыя сябры ёсць, сустракаемся сем'ямі, на жаль, не так часта.

— Красавіцкія выступленні рабочых вымушаюць сур'ёзна задумацца. Між тым, глыбокага асэнсавання гэтай з'явы мы пакуль не пачулі ні ад кіраўнікоў кампартыі, ні ўрада, ні Вярхоўнага Савета. Таму, думаецца, варта вярнуцца да тых дзён. Тады даводзілася чуць такія меркаванні: былі б у нас нармальныя прафсаюзы — не было б патрэбы ствараць страйкамы. У сувязі з гэтым хацелася б пачуць ад вас: што ўжо зроблена для таго, каб прафсаюзы сталі сапраўднымі абаронцамі працоўных і што мяркуецца яшчэ здзейсніць у гэтым кірунку?



— Лічу, што людзі пакінулі вытворчасць і рушылі на плошчу не за кімсьці, а супраць дапушчанай несправядлівасці, супраць зману.

Ці меўся выхад са становішча? Безумоўна. Калі б саюзнаму і рэспубліканскаму ўрадам хапіла мудрасці, а прафсаюзам — настойлівасці, то рэформа цэн пачалася б адначасова з рэформай заработнай платы. Такую прапанову, дарэчы, мы ўнеслі ў Савет Міністраў БССР яшчэ да павышэння цэн.

Аналізу красавіцкіх падзей, іх асэнсаванню, ацэнцы быў прысвечаны пленум Савета Федэрацыі, які адбыўся 18 красавіка гг.

«Нармальныя» прафсаюзы — гэта баявыя прафсаюзы, здольныя дзейнічаць кампетэнтна, рашуча. Перыяд станаўлення нашай Федэрацыі праходзіць у няпростых абставінах. Асноўную ўвагу ўдзяляем умацаванню і навучанню актыва прафсаюзных арганізацый, падрыхтоўцы і заключэнню калектыўных дагавораў.

На дзелавую, канструктыўную аснову пастаўлены нашы ўзаемаадносіны з урадам. Ніхто не зможа адмаўляць вынікова дзеянняў па прыняццю Закона аб індэксацыі, па адмене пяціпрацэнтнага падатку з прадуктаў харчавання, дзіцячага асартыменту і г. д.

Нядаўна ФПБ падпісала з Саветам Міністраў БССР пагадненне аб сацыяльных гарантыях у сувязі з пераходам да рынку на 1991 год, распрацаванае з улікам патрабаванняў працоўных калектываў. Наладжаны кантроль за яго выкананнем.

Выкарыстоўваем права заканадаўчай ініцыятывы. Падрыхтаваны праекты законаў аб прафесіянальных саюзах, ахове працы і іншыя.

— Чаму ж, на Вашу думку, у апошні час узмацнілася крытыка прафсаюзаў, прычым гучыць яна як «злева», так і «справа»? Гэта бачна і на прыкладзе нашага парламента, члены якога, нягледзячы на разнастайнасць сваіх поглядаў і перакананняў, аб'ядналіся і дружна адхілілі праект закона аб прафсаюзах, унесены ФПБ.

— Сёння прафсаюзы ўсё больш адыходзяць ад неўласцівых ім функцый, дзейнічаюць

(Заканчэнне на 2-й стар.).

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Благодарные строки

Больница, но не от слова «боль»

Жизнь и раньше заставляла обращаться к врачам. Лежала в больницах. Безрадостное занятие. Но вот попала в госпиталь инвалидов Великой Отечественной войны, что в Боровлянах, и впечатление мое о клиниках изменилось. Больница не от слова «боль», хотя много в ней израненных войной калек. Персонал старается сделать из нее санаторий. Так же лечат, так же оперируют, а настроение совсем другое. Даже белки в сосновом парке и те ручные. А о враче Ларисе Горбачевой можно писать книгу, судьбы больных — это ее судьбы, очень душевный человек.

Доброта нынче в дефиците. Но у сестер кардиологического отделения Валентины Гурецкой, Светланы Корпач, Татьяны Муравицкой, Зинаиды Евкупта ее не занимать. Завидую тем, кому еще повезет здесь лечиться.

Надежда ТОЧКО.
г. Ганцевичи.

Точка зрения

Закрыть лазейки

Власть Советов, по моему мнению, с каждым днем и часом в глазах простых людей теряет свой авторитет. А почему? Да потому, что надоело повседневно слушать пустые разговоры на сессиях Верховного и местных Советов.

Пора от слов переходить к делу. Пора принимать законы для блага человека.

А что мы имеем? Около сотни новых законов, а жизнь с каждым днем все хуже и хуже. В магазинах товаров практически нет. Но мы же работаем, кажется, не хуже, планы выполняем. Так где же, спрашивается, товар? Откуда они берутся у кооператоров? И по каких ценам? Так не пора ли Верховному Совету республики принять такой закон, который бы раз и навсегда закрыл лазейки для нечестных на руку дельцов? Думаю, пошатнувшийся авторитет от этого только возрастет.

Сергей ХОЛОДЦОВ.
г. Могилев.

ФОТО В НОМЕР

Во всех уголках республики и за ее пределами трудятся около 30 тысяч выпускников Белорусского института механизации сельского хозяйства.

Здесь созданы хорошие условия для приобретения прочных знаний.

Коллектив преподавателей, профессоров, доцентов делает все необходимое, чтобы их воспитанники стали хорошими специалистами и всесторонне образованными людьми. Нынешняя экзаменационная сессия — очередная ступенька на этом нелегком пути.

НА СНИМКЕ: декан факультета механизации сельского хозяйства Николай Иванович СЕМКИН со студентами V курса Виктором ЛУКАШЕНЕЙ, Александром СТАНКЕВИЧЕМ, Анатолием ХРАБРЫМ.

Фото Николая АМЕЛЬЧЕНКО.

Вступаю в полемику

С больной головы на здоровую

Не пора ли разобраться, кто у нас «деструктивные силы»!

В нашем плановом обществе даже письма в газеты, похоже, приходят по определенному и кем-то заданному графику. Порой кажется, что волны «общественного возмущения» создаются из какого-то одного центра — до того бывают похожи взрывы читательской активности. То «вдруг» после 7 ноября редакции заполнили написанные под одну идеологическую копирку разъяренные опусы, бичующие организаторов альтернативного митинга в Минске, теперь вот вновь сердца неспокойных граждан встрепенулись во время обсуждения в белорусском парламенте вопроса о департизации, деполитизации и национализации имущества КПБ.

Не осталась в стороне от общего порыва и «группа народных депутатов местных Советов Речицкого района», напечатав в «Народной газете» свое проникновенное открытое письмо 4-й сессии Верховного Совета БССР. Уже само начало письма, по замыслу, видимо, должно заставить читателя проникнуться к его авторам огромным уважением: «Мы, народные депутаты Гомельского областного, Речицкого районного, Заспенского, Артуковского, Вышемирского сельских Советов Речицкого района внимательно следим за ходом 4-й сессии Верховного Совета БССР...» Прочитал я, и в моем воображении сразу представляется идиллическая картина — собрались в одной комнате сорок народных депутатов, живущих в разных весях, и с замиранием своего идейного сердца смотрят телевизор, стараясь не упустить ни слова крамолы. Правда, упорно создается такое навязчивое впечатление, что телевизор этот, у которого собрались уважаемые депутаты, стоит не иначе, как в здании райкома партии. И видимо, сами стены этого почитаемого сооружения вдохновили бдительных товарищей на создание своего открытого письма...

Но если серьезно — давайте на самом деле задумаемся: как это вдруг сорок депутатов разных уровней оказались в одном месте и в едином порыве, взявшись за ручки, написали такую эпистолу?

Земля наша всегда была самородками богата, вот и в Речице нашлись сорок оракулов, которые знают, что делать Белоруссии: «Республика устала от дебатов и ждет от своих избранников конкретных и решительных мер по наведению порядка и защите Конституции». Ну, слава Богу. Теперь мы видим, чего хочет республика — спасибо речицким депутатам, просветили нас на этот счет, раскрыли наконец-то нам, сомневающимся, глаза. А я вот что им хочу сказать: вы бы хоть постеснялись глаголить за всю Белоруссию, вы бы хоть «от имени» своего района говорили!

Ну, да ладно! Поскольку республика наша — понятие довольно разноликое, авторы из Речицы решили дать конкретный наказ народным депутатам Верховного Совета: «...объединиться и призвать к порядку тех, кто, пользуясь трудностями, переживаемыми народом, стремится не к их преодолению, а к еще большему углублению, и на этой основе пытается пробиться к власти, чтобы навязать народу чуждые ему ценности». (Как вы, наверное, уже догадались, уважаемый читатель, речь идет об оппозиции). Только вот зря, по-моему, так хлопочут речицкие депутаты. Те, кто надо, давно уже объединились и сплотились в стройные ряды с одинаковыми костюмчиками и воззрениями. Вооружившись кнопками для голосования, чутко бдят они, дабы не пустить «чуждые народу интересы» (демократию, плюрализм, национальное возрождение и пр.).

Но, как говорят французы, «вернемся к нашим баранам». Авторов письма «глубоко волнует то», что «представители оппозиции вместо настойчивых поисков заняты исключительно борьбой с КПСС». И начал я вспоминать, как эта коварная оппозиция против нашей любимой партии козни строит. С самой первой сессии вспомнил, когда они, демократы, эти настырные, со своим суверенитетом лезли. Естественно, идейно стойкие товарищи его игнорировали; а потом, когда Москва «посоветовала» — можно, мол, уже — свой социалистический суверенитет подсунули. Вспомнилось мне и принятие закона о местном самоуправлении, когда эта хитроумная оппозиция (опять-таки наверняка для борьбы с КПСС) предложила местных руководителей выбирать всем населением. Но и тут верные партийцы не дали провести «чуждые народу идеи». Вспомнил я январские события в Вильнюсе, когда эти экстремистские демократы, во главе с оппозицией, в первый же день приняли осуждающий насилие документ; большинство же в Верховном Совете приняло постановление лишь на 5-й день после «кровавого воскресенья», и сего акта, кроме них самих, никто не заметил — время декларации уже прошло.

Так что всем нам нужно подумать, не перекладывают ли авторы письма вину с больной головы на здоровую.

Как это там у них еще? Ага, «нагнетание ненужных страстей», «безответственные действия», «ведущие к еще большей конфронтации». И кто это у нас страсти разжигает? Уж не та ли партия, лидер которой требует введения чрезвычайного положения? Не от этой ли партии депутаты (как, впрочем, и авторы «открытого письма») стращают нас пугалом гражданской войны?

«Безответственные действия»? Давайте вспомним. Кто отверг предложенный оппозицией закон о гражданстве, поставив наши исполнительные органы в непонятное положение перед лицом начинающейся приватизации? А кто не пожелал даже рассматривать новый закон о выборах (вновь-таки представленный оппозицией), проигнорировав тем самым требования бастовавших рабочих?

Ну, а насчет «ведущих к еще большей конфронтации»... Достаточно вспомнить, как год с лишним не регистрировали БНФ. Достаточно, подобно авторам письма, включить телевизор и услышать и увидеть, как вплоть до криков и топанья ногами — реагируют некоторые сердобольные депутаты на выступления столь ненавистных им оппозиционеров. Достаточно вспомнить отказ включить некоторых депутатов-демократов в состав постоянных комиссий. Казалось бы, простая формальность! Написал депутат заявление — Верховный Совет проголосовал. Так нет же! Если ты не «наш», не пустим тебя в комиссию! Обойдешься. Лучше на площадь ходи, митингуй.

Достаточно вспомнить все это, сесть и подумать, кто у нас сегодня в наибольшей степени тянет на роль деструктивной силы...

Виталий АЛЕКСЕЕВИЧ,
житель г. Минска.

Нам стала вядома

Батон супраць радыяцыі

На Клімавіцкім хлебазаводзе прыступілі да выпуску новага віда прадукцыі — батона «Здароўе» з мукі вышэйшага гатунку з дабаўленнем караціну.

У ім утрымліваецца правітамін, які прызначаны для масавага спажывання ў рэгіёнах з павышанай радыяцыяй.

Кошт батона — 52 капейкі.

г. п. Клімавічы.

Іван ЛАПО.

Как учит Нго Суан Бинь

40 мальчишек Пинска четыре раза в неделю посещают секцию по изучению боевого искусства «Нят-нам».

Тренировки проводят И. Шербацевич и В. Виноградов, которые знакомы с методами профессора Ханойского университета боевых искусств Нго Суан Биня.

Таким образом частично решается проблема занятости подростков в дни летних каникул.

Фёдор ГЛИНСКИЙ.
г. Пинск.

Наша гасцёўня

«НІ АБРОЦЬ, НІ ТЫМ БОЛЬШ ХАМУТ ПРАФСАЮЗЫ! НІКОМУ НЕ РЫХТУЮЦЬ, АЛЕ І НА СЯБЕ НАКІНУЦЬ НЕ ДАДУЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

больш актыўна, а гэта таго-сяго насцярожвае, не задавальняе.

З усёй адказнасцю хачу заявіць: тактыку сваіх дзеянняў наша Федэрацыя выпрацоўвае самастойна, без якога-небудзь ціску з боку. І ні аброць, ні тым больш хамут прафсаюзы нікому не рыхтавалі і не рыхтуюць. Але ж і на сябе накінуць не дадуць.

Што тычыцца разгляду на сесіі Вярхоўнага Савета БССР унесенага намі праекта закона. На прафсаюзы абрушыўся шквал крытыкі. Часам здавалася, што ва ўсіх бедах нашага грамадства вінаватыя адны прафсаюзы.

Мы не супраць крытыкі, тым больш, што крытыкаваць ёсць за што. Але ж аргументамі, што праект сыры, не падрыхтаваны, што ён навязаны зверху і патрэбен прафсаюзнаму апарату, які замахваецца ледзь не на ўсю паўнату ўлады, згадзіцца нельга.

Прафсаюзы не збіраюцца кіраваць вытворчасцю, гэта не іх задача. Яны не ставяць сябе над дзяржаўнымі органамі, але не павінны быць і пад імі. Няма падстаў і для таго, каб сцвярджаць аб падмене прафсаюзамі палітычных сіл. Адначасова з тым, як рэспубліка становіцца суверэннай дзяржавай, ідзе аб'ектыўны працэс развіцця самастойнасці, незалежнасці прафсаюзаў. Гэта і прапаноўваецца замацаваць заканадаўча.

Праект закона абмяркоўваўся ў пярвічных прафсаюзных арганізацыях, на пленуме Савета Федэрацыі, з'ездзе прафсаюзаў Беларусі. Згадзіцеся, што гэта важкая падстава для ўважлівых, сур'ёзных адносін да заканадаўчай ініцыятывы ФПБ, да прапанаванага праекта закона.

Чаму ж ён не быў прыняты ў першым чытанні? Гэта стане зразумела, калі азнаёміцца з пратаколам галасавання. Сярод тых, хто быў супраць, устрымаўся або зусім не галасаваў, большасць гаспадарчых, савецкіх кіраўнікоў, якім, зразумела, спакайней жылося з «кішэннымі» прафсаюзамі. Ёсць і прадстаўнікі апазіцыі ў парламенце, якія хацелі б замяніць сённяшнія прафсаюзы другімі.

Лічу, што дэпутаты павінны праявіць мудрасць, памяркоўнасць, адкінуць эмоцыі і амбіцыі, не кіравацца пры галасаванні толькі асабістымі ўзаемаадносінамі з канкрэтнымі прафсаюзнымі камітэтамі.

Мы дапрацавалі праект з улікам выказаных заўваг, паўторна ўнеслі яго ў Вярхоўны Савет. Думаю, прафсаюзам хопіць настойлівасці і прынцыповасці, каб дамагчыся яго прыняцця.

— Намаганнямі ўрада і Федэрацыі прафсаюзаў удалося патушыць той грамадскі пажар у красавіку. У рэспубліцы пачала складвацца канструктыўная сітуацыя. Але ў гэты час пракуратура, нягледзячы на запэўніванні высокіх асоб, узялася за кіраўнікоў забастовачных камітэтаў. Ці не з'явіцца такі крок нагнятаннем напружанасці?

— Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі падтрымала справядлівыя патрабаванні рабочых у час забастовак у пачатку красавіка гг. і выступіла супраць прыцягнення іх удзельнікаў да адміністрацыйнай і якой-небудзь іншай адказнасці. Рашэнне прэзідыума Савета ФПБ па гэтаму пытанню было апублікавана ў друку. Пракуратура рэспублікі з гэтым згадзілася.

Што датычыцца далейшых дзеянняў шэрага забастовачных камітэтаў па рэалізацыі палітычных патрабаванняў, то гэта выходзіць за рамкі статутаў прафсаюзаў. Іх прызначэнне — абарона сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў працоўных.

— На мітынгах даводзілася чуць сцвярджэнні, быццам некаторыя прафсаюзныя актывісты па-ранейшаму «скачуць польку-бабачку» пад дудку адміністрацыі і партапарату. Ці так гэта?

— У цэлым хачу адзначыць, што зараз многія прафсаюзныя камітэты ўзначальваюць кампетэнтныя, прынцыповыя, энергічныя работнікі, якія карыстаюцца даверам у членаў прафсаюза. Назаву некаторых з іх. Гэта Васіль Кануннікаў (аб'яднанне вылічальнай тэхнікі), Уладзімір Янковіч (аб'яднанне «Гарызонт»), Валянціна Палевікова (аб'яднанне «Гранат»).

У час красавіцкіх падзей на электрамеханічным заводзе забастовачны камітэт не ствараўся. Яго функцыі выконваў прафсаюзны камітэт, які ўзначальвае Валянцін Карабановіч. Наспелыя пытанні тут вырашаліся па-дзелавому.

Таму мы супраць масавых, агульных перавыбараў прафкамаў, да чаго заклікалі ў апошні час прадстаўнікі Мінскага стачачнага камітэта. Пры гэтым часта на ўвазе маюцца палітычныя мэты. Галоўным жа крытэрыем павінны быць менавіта дзелавыя якасці прафсаюзных камітэтаў, канкрэтныя вынікі іх работы па абароне правоў працоўных.

На жаль, ёсць яшчэ і прафкамы, якія падлашчваюцца да адміністрацыі, пагрузлі ў размеркавальных функцыях.

— З вуснаў высокіх асоб чуюцца заклікі аб увядзенні мараторыя на забастоўкі, мітынгі. А якая Ваша думка?

— Абгрунтаваныя патрабаванні, якія вылучаюць прафсаюзы па абароне правоў працоўных павінны выконвацца. Як гэта ажыццявіць, калі сустракаецца супраціўленне? Перш за ўсё праз перагаворы, пагадненні. Такая практыка стала нормай ва ўсіх развітых дзяржавах.

Законам прадугледжана і права прафсаюзаў на забастоўку. Але яно — запасная зброя, крайні варыянт. Мы разумеем, што забастоўкі, тым больш стыхійныя, некіруемыя, — сіла разбуральная. Таму імі трэба вучыцца карыстацца. Што датычыцца «высокіх асоб», то ім лепш заклікаць ліквідаваць прычыны, якія вядуць да забастовак.

Прафсаюзы рэспублікі, дамагаючыся вырашэння пастаўленых пытанняў, пакідаюць за сабой права арганізоўваць адзіныя калектыўныя дзеянні.

— Так, з забастоўкамі можна змагацца двума шляхамі: ліквідаваць прычыны, якія вымушаюць людзей на такі крок, і забараніць іх правядзенне. Чаму ў нас упор робіцца на другі варыянт?

— Не давесці справу да забастоўкі, своечасова вырашыць наспелыя праблемы ў рамках закона і шляхам перагавораў, кампрамісаў, дамагацца патрэбных вынікаў, безумоўна, цяжка, складана. Трэба рухаць наперад эканамічную і палітычную рэформы. Прасцей узяць ды і забараніць. Мяркую, менавіта таму ў нас часцей схіляюцца да забаронных мер. Але ж гэта, як кажуць,— загнаць хваробу ў сярэдзіну.

— Прадстаўнікі многіх сіл выказваюцца за кансалідацыю. Чаму яе няма? Што перашкаджае?

— На мой погляд, няма агульнай ідэі кансалідацыі. Ідэя перабудовы ўжо не дзейнічае. На жаль, ідэя нацыянальнага адраджэння, як гаворыцца, не авалодала масамі. А лозунгі, заклікі да дыялога і супрацоўніцтва ўсіх грамадска-палітычных сіл не падмацоўваюцца канкрэтнымі крокамі, справамі. Не паказвае ў гэтым належнага прыкладу і парламент.

— Вядома, наш рабочы чалавек жыве кепска. Мала зарабляе. А тут такі скачок цэн. І гэта пасля Чарнобыля! Калі, здавалася б, трэба было б па самых нізкіх цэнах прадаваць вітамінную прадукцыю. Якую падтрымку акажуць нам прафсаюзы?

— Федэрацыя прафсаюзаў унесла свае прапановы ў праект антыкрызіснай праграмы, які разглядаўся на цяперашняй сесіі. Сёння, як мне здаецца, трэба не гаварыць аб рынку, а рэальна ствараць нармальныя ўмовы развіцця вытворчасці розных форм уласнасці ў горадзе і вёсцы. Стымуляваць выпуск якаснай прадукцыі, даць чалавеку магчымасць зарабіць.

Як вядома, у выніку прынятых з удзелам прафсаюзаў мер зняты ў многім абмежаванні на рост заработнай платы, пачалося павышэнне ставак у вытворчых і невытворчых галінах. Уведзены кампенсацыі на харчаванне ў рабочых, студэнцкіх і школьных сталоўках, зніжаны цэны на праезд у прыгарадным транспарце. Павялічаны выплаты бацькам у сувязі з падаражэннем дзіцячых тавараў, захаваны былі памер аплаты ў дзіцячых садках. Прыняты шэраг канкрэтных захадаў па ўзмацненню сацыяльнай абароны студэнцтва і вучнёўскай моладзі.

Важнейшая праблема, над якой мы зараз працуем разам з урадам,—падрыхтоўка і правядзенне рэформы заработнай платы. Гэта пытанне было разгледжана на пленуме Савета Федэрацыі ў красавіку гг. Якія тут нашы асноўныя прынцыпы і падыходы? Устанаўленне мінімальнай зарплаты, роўнай сённяшняму пражытачнаму мінімуму, зняцце ўсіх абмежаванняў на яе рост, комплексны падыход да рэфармавання аплаты працы — гэта значыць перагляд ва ўсіх галінах.

Прыступілі да перагавораў з міністэрствамі і ведамствамі па заключэнню галіновых тарыфных пагадненняў на 1992 год. Прафсаюзныя камітэты прадпрыемстваў, арганізацыі праз пагадняльныя камісіі з ліку прадстаўнікоў адміністрацыі, прафкамаў, страйкамаў, спецыялістаў выпрацоўваюць падыходы да рэформы зарплаты, вызначаюць этапы яе правядзення, крыніцы павышэння тарыфных ставак і акладаў, а таксама механізм раздзяржаўлення і прыватызацыі ўласнасці, у тым ліку праз народныя акцыі.

— Чарнобыль востра паставіў пытанні медыцынскага абслугоўвання, аздараўлення, адпачынку. Пуцёўкі ў санаторый парадажэлі. Як падлячыцца, адпачыць?

— У бягучым годзе ў сувязі з павышэннем оптавых і рознічных цэн кошт пуцёвак на санаторнае лячэнне, адпачынак, турызм сапраўды значна ўзрос. Сёе-тое прафсаюзы рэспублікі зрабілі.

Да ліпеня санаторныя пуцёўкі прадаваліся па старой цане (датацыі і за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання). А з ліпеня ў адпаведнасці з рашэннем прэзідыума Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі памер частковай даплаты, аплачваемай працоўнымі за пуцёўкі на лячэнне і адпачынак паніжаны з 30 да 15 працэнтаў. Да 20 працэнтаў пуцёвак выдаюцца бясплатна (раней у дамы адпачынку выдаваліся бясплатна толькі 10 працэнтаў пуцёвак).

За кошт сродкаў сацыяльнага страхавання да 6 рублёў у дзень павялічана грашовая норма выдаткаў на харчаванне ў санаторыях-прафілакторыях.

— Ці хутка з'явяцца ў нас новыя санаторыі, дамы адпачынку?

— Лічу, што гэта пытанне трэба адрасаваць не толькі мне, але і ўраду, органам улады на месцах, бо клопат аб здароўі працоўных — справа дзяржавы. Да таго ж, прафсаюзам належыць толькі частка санаторыяў, прычым, меншая.

Адносіны да будаўніцтва матэрыяльнай базы аздараўлення кепскія. Па гэтаму пытанню мы неднаразова звярталіся ва ўрад і Вярхоўны Савет БССР. І зараз па сутнасці толькі прафсаюзы і «Белміжкалгасздраўніца» будуюць санаторыі ў рэспубліцы. Тое ж датычыць і аздараўленчых лагераў. А, улічваючы чарнобыльскую праблему, без уласнай базы аздараўлення нам не абысціся.

— Якія перспектывы замежнага турызму?

— Пакуль што невялікія. Што стрымлівае? Не хапае валюты, а на безвалютны турысцкі абмен у рэспубліцы зараз уведзены абмежаванні. Мы лічым, іх трэба зняць. У нас наладжаны кантакты з многімі краінамі, якія, як і мы, зацікаўлены ў развіцці замежнага турызму.

— Вядома, Уладзімір Іванавіч, на ўсё гэта патрэбны сродкі, якіх не хапае. І тут можна сёе-тое зразумець. Але як зразумець, што на землях, пакрытых чарнобыльскім пылам, вырошчваецца ўраджай, які трапляе на наш стол? Чаму прафсаюзы не б'юць ва ўсе званы?

— Б'юць. У ліку першых прафсаюзы ўнеслі прапанову ў Вярхоўны Савет БССР пры абмеркаванні праекта Закона «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» аб забароне вытворчасці любых відаў сельскагаспадарчай прадукцыі на забруджаных тэрыторыях і яе рэалізацыі. Больш таго, мы патрабавалі ўключыць у закон палажэнне аб прыцягненні ўсіх, хто яго парушае, не толькі да адміністрацыйнай, але і крымінальнай адказнасці. Дэпутаты прынялі гэту прапанову.

— У пісьмах, якія ідуць у «Народную газету», працоўныя заяўляюць: не будзем выкупляць свае кватэры, заводы, яны і так нашы. Ваша думка?

— Як я разумею, Вы хацелі б ведаць пазіцыю прафсаюзаў адносна прыватызацыі ўласнасці. Мы зыходзім з таго, што яна павінна ажыццяўляцца ў інтарэсах працоўных.

Падыходы могуць быць рознымі. Скажам, здзяйсняючы прыватызацыю прадпрыемстваў гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, можна перадаць у доўгатэрміновую арэнду, аддаць маёмасць у доўг, прадаць, а не проста пусціць з аўкцыёна ў прыватныя рукі. У прынцыпе, уласнікамі павінны стаць грамадзяне прапарцыянальна іх працоўнаму ўкладу на аснове народных акцый.

— Як Вы ацэньваеце дзейнасць урада? Што ён добрага зрабіў для працоўных, што дрэннага?

— Асноўны крытэрый дзейнасці любога ўрада ў тым, ці сталі людзі жыць лепш, ці сталі яны багацей матэрыяльна, духоўна.

Галоўнае, на мой погляд, што ўдалося зрабіць ураду,— гэта не дапусціць рэзкага падзення вытворчасці ў рэспубліцы.

Што перашкаджае? Недастаткова рашучыя крокі па рэалізацыі эканамічных праграм, у тым ліку па знешнеэканамічнай дзейнасці, прапанаваных самім жа урадам.

— А цяпер, Уладзімір Іванавіч, давайце паспрабуем зазірнуць наперад. Калі мы зажывём лепш? І што гэтаму пасадзейнічае?

— Мяркую, што пры сённяшняй сітуацыі — не хутка. Мне прыходзілася ўжо неаднойчы выказвацца: без стабільнасці, працавітасці, павагі да закона, адзін да аднаго— не можа быць ніякага руху наперад. У гэтым кірунку павінны быць рашучыя крокі і з боку ўрада, і Вярхоўнага Савета БССР. Многае тут могуць і павінны зрабіць прафсаюзы, патэнцыяльныя магчымасці якіх яшчэ далёка не рэалізаваны. Галоўная наша задача зараз — умацаваць іх, дабіцца рэальнай самастойнасці, незалежнасці.

Пытанні задаваў
Іван МАКАЛОВІЧ.

День Союза

ТАШКЕНТ НУЖДАЕТСЯ В РАБОЧИХ

Предприятиям и стройкам Ташкента не хватает сейчас свыше 15 тысяч рабочих. Только на авиационном заводе насчитывается около 2 тысяч вакансий, а на текстильном комбинате — 1,5 тысячи. По словам директора центра набора и подготовки кадров текстильного комбината Абдухарака Абдуллаева, это перешедшее на аренду предприятие, на котором можно заработать до тысячи рублей в месяц, вынуждено использовать вахтовый метод привоза рабочих из соседних районов Казахстана. Между тем в самом городе, как это ни парадоксально, считаются нетрудоустроенными примерно 25 тысяч его жителей.

ДОЛЛАРЫ ПОКОРЯТ ПИК КОММУНИЗМА

Каждый шаг иностранца на склонах Пика Коммунизма будет приносить теперь звонкую монету казне Таджикистана, на территории которой расположена эта высочайшая в Советском Союзе вершина (7.495). Организовать экспедиции зарубежных альпинистов поможет созданное здесь внешнеэкономическое общество «Памир».

Покорение «семитысячника» обойдется иностранному клиенту в несколько сотен долларов.

АГРАРНИКИ ДВУХ СТРАН, ОБЪЕДИНЯЙТЕСЬ!

В поселке Мир (Брестская область) десять белорусских и примерно столько же чехословацких кооперативов, хозяйств и организаций создали совместное предприятие «Агроимпекс». Цель его — объединить усилия в производстве продуктов питания, наладить взаимное снабжение передовой техникой, семенами, продукцией. Предполагается даже совместная эксплуатация магазинов, гостиниц и ресторанов.

«ЕВРОМЕТАЛЛ» ПРЕДЛАГАЕТ СОТРУДНИЧЕСТВО

Международная ассоциация «Еврометалл» намерена принять участие в модернизации крупнейших предприятий Кольского горнопромышленного комплекса путем прямых инвестиций. Такое предложение было сделано представителями «Еврометалла» руководству ведущих предприятий ГПК во время их недавней поездки в Мурманскую область.

МЕМОРИАЛ ЯПОНСКИМ ВОЕННОПЛЕННЫМ В СИБИРИ

В поселке Листвянка, расположенном на берегу Байкала в 70 км от Иркутска, открыт мемориал японским военнопленным. На обелиске увековечены имена захороненных здесь японцев. А установили их активисты созданной недавно в городе Ассоциации гуманитарного сотрудничества с зарубежными странами «Истина». В церемонии открытия приняли участие свыше 200 членов всеяпонской ассоциации бывших военнопленных во главе с ее президентом Рокуро Сайто.

МОРСКОЙ ЗАПОВЕДНИК — ВОЕННЫЙ ПОЛИГОН

Президиум Владивостокского городского Совета народных депутатов предложил штабу Тихоокеанского флота закрыть авиаполигон, находящийся в самом центре единственного в СССР морского заповедника «Залив Петра Великого», являющийся одновременно и запретной военной зоной.

Предложение депутатов Владивостока осталось пока без ответа. Молчанием ответил штаб Тихоокеанского флота на многие другие предложения, связанные с охраной окружающей среды.

ФАМИЛЬНАЯ АРКА В САМАРКАНДЕ

Перед въездом в город Ургут в Самаркандской области возводится десятиметровая арка. Строится она на личные средства семьи колхозника Кучкара Эогашева, занимающегося разведением табака. У мусульман есть обычай, который называют «Садока» («подарок-пожертвование»). Вот и решили Эогашевы подарить родному городу «Ворота Ургута». Местные власти помогли с приобретением стройматериалов. Сметная стоимость стройки — более 50 тысяч рублей.

КАК ПОДАТЬ ТОВАР ЛИЦОМ!

Несмотря на высокий спрос за рубежом, молдовские вина и коньяки продаются там по весьма низким ценам. Бутылка молдовского шампанского, несмотря на то, что по своим качествам оно не уступает французскому, стоит всего 3 доллара. Причина этого — отсутствие красочных, броских этикеток, плохая реклама продукции. Похоже, правда, что в скором будущем эта проблема будет решена. Одна из американских фирм взялась рекламировать продукцию молдовских виноделов в странах Латинской Америки.

(«Инфоновости»).

Ураду—новыя паўнамоцтвы, парламенту—больш грошай

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

вінна быць адпрацавана. У нашым жа Вярхоўным Савеце пакуль не ўсё ідзе складна. Шмат разоў гаварылася, што яго састаў вельмі вялікі — і таму адзін выбраннік, магчыма, працуе па 18 гадзін у суткі, а другі адбывае нумар. У адной камісіі дня адпачынку не бывае, а ў другой пераважае лёгкі настрой. Дарэчы, аб гэтым гаварылі самі дэпутаты. Дырэктар БелАЗа Дзмітрый Сыракваш аднойчы паспрабаваў знайсці па тэлефоне каго-небудзь для кансультацыі ў камісіях Вярхоўнага Савета і патраціў вельмі шмат часу, бо дзесяткі тэлефонаў у рабочы дзень не адказвалі. Сакратар толькі адной камісіі быў на месцы.

Дэпутат-ваеннаслужачы Валерый Паўлаў прыйшоў да высновы аб неабходнасці скараціць колькасць камісій, тым самым зменшыцца штат работнікаў.

Як вы ведаеце, становішча ў нас надзвычайнае, прынята рашэнне аб скарачэнні выдаткаў на кіраванне. Чаму ж усе будуць уціскацца, а Вярхоўны Савет будзе падаваць адмоўны прыклад?

